## § 52. Размнажэнне, развіццё і паводзіны млекакормячых

**Успомніце: 1.** Якія органы размнажэння самак і самцоў вы ведаеце? **2.** У чым выяўляецца клопат аб патомстве ў раней вывучаных прадстаўнікоў хордавых?

Млекакормячыя — раздзельнаполыя жывёлы. У большасці відаў назіраецца палавы дымарфізм. У перыяд размнажэння млекакормячыя ўтвараюць пары або сем'і, дзе на аднаго самца прыпадае некалькі самак.

**Размнажэнне і развіццё млекакормячых.** Органы размнажэння самца сабакі — парныя семяннікі, у якіх утвараюцца сперматазоіды. Органы размнажэння самкі сабакі прадстаўлены парнымі *яечнікамі*. Сфарміраваныя яйцаклеткі трапляюць у *яйцаводы*. Левы і правы яйцаводы адкрываюцца ў асаблівы мышачны орган — ***матку***, сценкі якой здольны моцна расцягвацца (мал. 182 на с. 199). Апладненне ў млекакормячых унутранае, адбываецца ў яйцаводзе. З гэтага моманту пачынаецца ўнутрывантробнае развіццё аплодненай яйцаклеткі (зіготы) у арганізме маці. Рухаючыся па яйцаводзе, зігота развіваецца ў мнагаклетачны зародак, які трапляе ў матку. У матцы фарміруецца ***плацэнта*** (дзіцячае месца) — орган, дзе крывяносныя сасуды зародка і маці цесна сутыкаюцца. Па сасудах пажыўныя рэчывы і кісларод, раствораныя ў крыві, трапляюць ад маці ў арганізм зародка, а ад зародка ў арганізм маці пападаюць прадукты яго жыццядзейнасці і вуглякіслы газ. Зародак з плацэнтай злучаны пупавінай.

Перыяд унутрывантробнага развіцця плода ў млекакормячых розных відаў розны: у мышэй ён доўжыцца 19 сутак, у сабакі — 2 месяцы, у каровы — 9 месяцаў. Пасля таго як плод цалкам сфарміруецца, надыходзяць роды: мышачныя сценкі маткі скарачаюцца і выштурхоўваюць плод з арганізма маці. Нованароджанае дзіцяня робіць першы ўдых, лёгкія яго распраўляюцца, і яно пачынае дыхаць самастойна. Такі спосаб узнаўлення патомства, пры якім зародак развіваецца ў матчыным арганізме і нараджаецца ў выглядзе дзіцяняці, называецца *жыванараджэннем*.

Частата размнажэння ў млекакормячых залежыць ад іх памераў і працягласці выношвання плода. Чым меншыя памеры жывёлы і карацейшая працягласць выношвання, тым часцей млекакормячыя размнажаюцца. Дробныя млекакормячыя (напрыклад, мышы) могуць

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»

пладзіцца 5–8 разоў за год, а буйныя (сланы) нараджаюць аднаго ці двух дзіцянят адзін раз у некалькі гадоў.

Жывёлы, якія вымушаны ўцякаць ад драпежнікаў і не будуюць ханкі (зубры, ласі, казулі, алені), нараджаюць дзіцянят, якія з першых дзён жыцця здольны ісці за маці. Дзіцяняты млекакормячых, якія нараджаюцца ў хованках (лісы, ваўкі, мядзведзі), з'яўляюцца на свет сляпымі і бездапаможнымі.

**Паводзіны млекакормячых.** Адным з галоўных інстынктаў млекакормячых з'яўляецца клопат аб патомстве. Самкі выкормліваюць дзіцянят малаком — асаблівасць, характэрная для ўсіх прадстаўнікоў класа. Наяўнасць у большасці млекакормячых губ і шчок — гэта прыстасаванне да смактання малака. У малацэ ўтрымліваюцца ўсе рэчывы, неабходныя для росту і развіцця дзіцянят. Самка дае дзіцянятам малако, пакуль яны не падрастуць і не навучацца карміцца самастойна.

Яшчэ адной праявай клопату аб патомстве з'яўляецца будаўніцтва хованак для будучых дзіцянят. Часцей за ўсё клапоціцца аб дзіцянятах самка: саграввае нованароджаных цяплом свайго цела, сочыць за іх гігіенай. Бацькоўскія паводзіны ўласцівы і самцам — яны здабываюць корм для малых, якія ўжо падраслі. Абое бацькоў абараняюць дзіцянят ад небяспекі, перадаюць паляўнічы і іншыя навыкі. Праявы клопату аб патомстве розныя ў розных відаў млекакормячых, яны залежаць ад колькасці народжаных дзіцянят.

**Паўторым галоўнае.** Млекакормячыя — раздзельнаполыя жывёлы, для большасці характэрны палавы дымарфізм. Апладненне ўнутранае, адбываецца ў яйцаводзе. Развіццё ўнутрывантробнае. Ёсць матка (мышачны орган), плацэнта (дзіцячае месца). Характэрная для ўсіх млекакормячых асаблівасць — выкормліванне дзіцянят малаком. Праявы клопату аб патомстве розныя ў розных відаў млекакормячых, яны залежаць ад колькасці дзіцянят.

**Пытанні і заданні.** **1.** Якія асаблівасці будовы палавой сістэмы ёсць у самкі млекакормячых? **2.** Ад чаго залежыць частата размнажэння ў млекакормячых? **3.** Як млекакормячыя клапоцяцца аб патомстве? **4.** Якія перавагі дае выкормліванне дзіцянят малаком?

Правообладатель «Адукацыя і выхаванне»